Гродзенскі ардынарый запрашае на Дыяцэзіяльныя дні моладзі

Аўтар: Біскуп Гродзенскі
25.04.2014 00:00



Дарагая Моладзь!

Вучні школ, прафесійных устаноў і Студэнты вышэйшых навучальных устаноў!

Запрашаю Вас 16–18 мая на чарговыя Дыяцэ-зіяльныя дні моладзі нашай дыяцэзіі. У гэтым годзе Вас будзе прымаць парафія Божай Міласэрнасці ў Гродне (мікрараён Вішнявец).

Галоўным дэвізам сустрэчы будуць словы: “Убогія духам маюць доступ да неба”. Заахвочваю Вас прыняць удзел у сёлетніх Днях моладзі як мага больш шматліка. Дыяцэзіяльныя дні мо-ладзі – гэта сумесны час для маладых людзей, каб разам святкаваць і радавацца да-рам маладосці па-хрыс-ціянску.

Падрабязную інфар-мацыю наконт удзелу можна будзе атрымаць у сваіх святароў і душ-пастараў моладзі.

На плённую падрых-тоўку і ўдзел у сустрэчы ўсім ад усяго сэрца бласлаўляю.